**Траццяк, І.** Вось так працавалі настаўнікі ў далёкія 20-ыя гады / І. Траццяк // Патрыёт (Ушачы). – 1998. – 31 снеж. – С. 4.

## ВОСЬ ТАК ПРАЦАВАЛІ НАСТАЎНІКІ Ў ДАЛЁКІЯ 20-ЫЯ ГАДЫ

У занальным дзяржархіве ў горадзе Полацку, у фондзе Ушацкага раённага выканаўчага камітэта, маюцца справаздачы школ Ушацкага раёна. Чытаючы гэтыя дакументы, можна даведацца шмат цікавых фактаў аб стане школ Ушацкага раёна ў 20-ыя гады: аб тым, у якіх умовах яны працавалі, як былі забяспечаны мэбляй, вучэбнымі дапаможнікамі, пісьмовымі прыналежнасцямі.

У архіўных дакументах захаваліся данясенні і справаздачы Весніцкай школы, якая ў 1924 годзе была школай І ступені, а ў 1927 годзе рэарганізавана ў беларускую двухкамплектную чатырохгадовую школу першай ступені.

У 1924 годзе ў школе было 4 класы і навучалася 70 вучняў, поўнасцю адсутнічалі пісьмовыя прыналежнасці і кнігі, а з мэблі мелася толькі 9 старых лавак, адна шафа для кніг, тры стулы і адзін кухонны стол. Як сведчаць архіўныя дакументы, у 1927 годзе ў школы быў ужо свой новы, але яшчэ не закончаны будынак. Зроблены былі толькі два класныя пакоі, таму заняткі ў 1927–1928 навучальным годзе пачаліся са спазненнем – 21 лістапада. У школе навучалася 130 вучняў. Пісьмовымі прыналежнасцямі і падручнікамі школа была забяспечана на 90 працэнтаў для 1–3 класаў, а для 4-ых – на 60 працэнтаў. Бібліятэкі ў школе не было.

У 1930 годзе заняткі пачаліся 17 верасня. У школе навучалася ўжо 149 вучняў. Школьны раён ахопліваў 10 населеных пунктаў, у якія ўваходзілі вёскі: Весніцк, Оснава, Дубінец, Першамайск, Капцы, Садкі і іншыя. Школьны будынак патрабаваў сур'ёзнага рамонту, бо быў дрэнна пабудаваны. Вучэбнымі дапаможнікамі школа забяспечана ў поўным аб'ёме, а школьная бібліятэка налічвала 164 кнігі.

Са справаздач Кубліцкай беларускай школы першай ступені даведваемся, што ў школе навучалася 170 вучняў. Сярод іх былі дзеці сялян, саматужнікаў, членаў прафсаюза. Па нацыянальнаму саставу дзеці размяркоўваліся наступным чынам: беларусаў – 147, яўрэяў – 20, палякаў – 4. У школе быў выбраны старастат, працавалі санітарная і гаспадарчая камісіі. Вучні выпускалі газету «Кубліцкі школьнік».

У 1929–1930 навучальным годзе ў школы быў дзяржаўны будынак, які патрабаваў рамонту. У сувязі з увядзеннем усеагульнага навучання школа абслугоўвала 13 населеных пунктаў Кубліцкага сельсавета. Значная частка дзяцей не вучылася з-за адсутнасці ў школе месцаў. Згодна з архіўнымі дакументамі на 1 лютага 1930 года ў школе навучалася дзяцей 8–11 гадоў – 65 чалавек, 11–15 гадоў – 58 чалавек. Сацыяльны састаў навучэнцаў быў наступны: дзяцей рабочых – 8, батракоў – 10, саматужнікаў – 6, служачых – 7, сялян – 92. Усяго на 1 красавіка навучалася 123 вучні.

У школе працаваў антырэлігійны гурток, які наведвала 67 вучняў, быў створаны «Куток бязбожніка». Інтэрнацыянальнае выхаванне было накіравана на ўмацаванне сяброўскіх сувязей з вучнямі і піянерскім атрадам яўрэйскай школы. Праводзіліся сумесныя пасяджэнні вучкама і піянерскія зборы. У Кубліцкай школе пад кіраўніцтвам настаўнікаў і камсамольскай ячэйкі дзейнічаў піянерскі атрад, які налічваў 40 піянераў.

Мосарская школа была адкрыта ў час земства, але ўказаць дакладную дату немагчыма з-за адсутнасці архіва.

Са справаздачы, якая складзена настаўніцай школы Агаф'яй Іванаўнай Стэфановіч-Шнітко 8 лістапада 1925 года, даведваемся, што школа часова размяшчалася ў доме былога эканома маёнтка Мосар, бо школьны будынак рамантаваўся. У школе навучалася 80 вучняў: не хапала парт і падручнікаў. Так, у першым класе на 36 вучняў было толькі 13 лемантароў «Роднае слова» Некрашэвіча.

У 1927 годзе школа была рэарганізавана ў двухкамплектную і абслугоўвала 9 населеных пунктаў. У школе навучалася 117 вучняў. У справаздачы аб дзейнасці школы за 1929–1930 гады ёсць звесткі аб тым, што каштарыс школы склаў 1775 рублёў 94 капейкі. На аднаго вучня даводзілася 21,6 рубля.

Мэбляй школа, у асноўным, была забяспечана, але трэба было зрабіць 5 лавак, дзве класныя дошкі і купіць 3 стулы. Школьная бібліятэка налічвала 156 кніг.

У 1929–1930 навучальным годзе васьмі бяднейшым вучням была аказана дапамога: выдадзена восем пар абутку.

Матырынская школа адкрыта ў 1906 годзе, як земская, а ў 1918 годзе рэарганізавана ў школу першай ступені. Школа знаходзілася ва ўласным будынку, які пабудаваны ў 1916 годзе, і абслугоўвала населеныя пункты Матырына, Гарані, Камароўшчына, фальваркі Матырына і Пяскі, частку хутара Роўбы.

Падручнікамі школа была забяспечана на 90 працэнтаў, але яны не адпавядалі патрабаванням, бо не адлюстроўвалі сучасную рэчаіснасць. Школьная бібліятэка налічвала 58 кніг.

Пры школе быў агарод плошчай 0,39 гектара, якім карысталіся настаўнікі.

Вось у такіх нялёгкіх умовах працавалі настаўнікі Ушацкага раёна ў 20-ыя гады.

**І. Траццяк**